ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
09 07 2015 г.

SEX-БАЛЯСЫ

# МАЎЧАЦЬ, ГАВОРАЦЬ, РОБЯЦЬ...

**...Справа была зімой. Аднойчы вырашыў вынесці з кватэры смецце. Кажу жонцы, якая ў суседнім пакоі прасуе бялізну: маўляў, я да смеццеправода, туды і назад. Далей адчыняю дзверы ў тамбуры і літаральна лоб у лоб сутыкаюся з суседзямі. Мы вітаемся адно з адным і працiскаемся кожны ў патрэбным яму напрамку. Ад нечаканай сустрэчы я машынальна зачыняю за сабой дзверы. І ў тую ж секунду разумею, што ключ жа я з сабой не браў! А кнопкі кватэрных званкоў на лесвічную пляцоўку ў нашым доме амаль ні ў каго не выведзены... Нешта рабіць трэба тэрмінова, бо я апрануты зусім лёгка. Хуценька выкідваю смецце і з вядром еду ўніз, да ўваходных дзвярэй. Паколькі і ад іх ключа ў мяне з сабой няма, адчыніўшы дзверы знутры, высоўваюся па пояс, каб дацягнуцца да дамафона. Набіраю нумар кватэры. Ідуць гудкі, але ў адказ — цішыня...**

Набіраю зноў, чакаю, думаючы пра тое, каб не апынуцца ўвогуле па-за пад'ездам. Нарэшце, чую незадаволены жончын голас: «Хто?» Кажу: «Свае, адчыняй тамбур...» Зайшоўшы ў кватэру, пытаюся ў яе, чаму не падыходзіла так доўга да дамафона. Яна ў адказ: «А я яшчэ думаю, чаму ты сам не падыходзіш да яго?» Пра маё папярэджанне, што іду выкідваць смецце, яна, зразумела, забылася — проста таму што была на сваёй хвалі, у сваіх думках. Мабыць, многія ведаюць, што гэта такое. («Жанчына, якая на ўсе твае пытанні адказвае фразай «усё нармальна», — гэта самая небяспечная з'ява ў свеце».) Дык гэта яшчэ ўсё па-добраму абышлося. Бо здараецца ж, як у тым анекдоце. «Сёння ранкам спакойна спытаўся ў жонкі: «Ты чайнік паставіла?» Пакуль моўчкі чысціў зубы, даведаўся, што яна ў мяне рабыня, я яе не цаню, перастаў бачыць у ёй жанчыну і нам увогуле пара разводзіцца, бо я знайшоў іншую... Нішто сабе гарбаткі папіў!»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Калі ад думак жанчыны пераходзяць да спраў, таксама часам не засумуеш. Вось нядаўна, каб падтрымаць зборную Венесуэлы на Кубку Амерыкі па футболе, вядучыя тэлеканала «Голыя навіны» рэгулярна... распраналіся ў жывым эфіры (у прынцыпе, а чаго яшчэ чакаць ад работнікаў канала з такой назвай? А адна з іх падчас турніру забаўлялася тым, што рабіла прагнозы на матчы з дапамогай сваіх грудзей. Яна прымацоўвала да аголенага бюста сцяжкі каманд, а пасля без дапамогі рук спрабавала іх скінуць (эх, група «Топлес» такі шанец упусціла на нядаўнім чэмпіянаце Еўропы па мастацкай гімнастыцы!). Згодна з яе прагнозамі, прайграе тая каманда, чый сцяжок зваліцца першым... Дарэчы, не так даўно бачыў у інтэрнэце фатаграфію: у расійскай краме ля касы стаіць імправізаваная скрыня для ахвяраванняў з надпісам: «На новыя ногі футбалістам». Такі жарт мог напісаць толькі мужчына, які разумее, што адным толькі выглядам аголеных бюстаў вынікаў не дасягнуць, прынамсі ў футболе.

Зноў жа — пра іх думкі. «Хачу гарбаты!» — сказала дама і чамусьці адчыніла халадзільнік. Так-так, гэта ўсё пра жаночую логіку: чаго б такога паесці, каб пахудзець? Ну, з гэтым яшчэ мірыцца можна. А бывае ж і так. «Нікуды я з табой не пайду!!!» — «А чаго ты тады так прыбралася?» — «А каб ты бачыў, якая прыгажуня з табой нікуды не пайшла!» Яшчэ горш, калі ў іх з'яўляюцца такія думкі. «Пасварылася з сужэнцам, адвярнулася, ляжу і думаю: «Абдымі, ну, абдымі, блін!» І тут ён абдымае мяне, а я: «Так, рукі прымі!»

Але самая «песня» — гэта калі прадстаўніцы прыгожага полу кантактуюць паміж сабой. Адна сяброўка тэлефануе другой: маўляў, чым займаешся. «На веласіпедзе катаюся», — адказвае першая. «Каб пахудзець?» — «Не, навошта?» — «Ну, каб лішнюю дзірачку ў рэмені зрабіць»...

Паглядзіце, як гавораць пра строі ўдзельніц якога-небудзь конкурсу стылісты-жанчыны. «Спадніца прыгожа падкрэслівае тонкую талію і стройныя ногі дзяўчыны! Але кашуля з кветкавым прынтам з ёй абсалютна не спалучаецца. Лепш замяніць яе аднатоннай блузкай ці кароткім топам. А цёмныя калготкі — цялеснымі». У мужчынскіх мазгах адразу пачынае пульсаваць фраза з вядомага кінафільма: «Не зразумеў! Перакладзі!» Як быццам бы стыліст зрабіла камплімент, але фактычна прагучала зусім супрацьлеглае... «Сіняя сукенка і белы жакет не спалучаюцца з фіялетавымі туфлямі. У гэтым выпадку нават чорны абутак глядзеўся б лепш. Але ўвогуле вобраз неблагі, а галоўнае — універсальны!» Як кажуць, не жаночая гэта справа — маўчаць...

Наогул, сітуацыю добра перадае такі анекдот. «Жанчына — як кошка. Намякае вам, што сыходзіць. Адчыняеш ёй дзверы — не ідзе. Закрываеш — хоча сысці. Адчыняеш — не ідзе». Насамрэч, ёсць адзін спосаб зразумець жанчыну. Толькі яго ніхто не ведае...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «МОЙ САКРЭТ — У НАТУРАЛЬНАСЦІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Аднойчы вы сказалі, што жанчыны павінны любіць сябе, як робяць гэта мужчыны...***

— Я заўсёды здзіўлялася і абуралася, назіраючы ў тым жа грамадскім транспарце сітуацыю, калі жанчыны сваіх дзяцей, мужа садзяць на вольныя месцы, а самі стаяць. У такія моманты сціраецца ўсялякае выхаванне, павага да старэйшых, да жанчыны ў прыватнасці. Таму хацелася б, каб жанчына любіла і цаніла сябе, як павінна. Тады і яе будуць любіць, адчыняць дзверы, падаваць руку... Вы пачынаеце паводзіць сябе як лэдзі — і ваш мужчына міжвольна стане праяўляць галантнасць.



***— Вы лёгка пускаеце людзей у сваё жыццё?***

— Пускаць пускаю, але цяпер паводжу сябе больш асцярожна з імі, бо за гады шмат адмоўнага вопыту назапасілася. Не адкрываю староннім душы. Я цаню ў людзях адкрытасць, прыстойнасць і шчырасць. І люблю чуць пра сябе, няхай і горкую, але праўду.

***— Вы featureознабакова сябе рэалізоўваеце: гастралюеце з канцэртамі, кіруеце агенцтвам па арганізацыі свят — і робіце ўсё паспяхова... Сакрэт ва ўменні планаваць і разлічваць свае крокі?***

— Поспех — паняцце адноснае. У параўнанні, скажам, з Мадоннай і яе папулярнасцю, я наўрад ці нечага дасягнула. А вось у нашай краіне я куды больш паспяховая, чым яна. Лічу, што сакрэт у маёй натуральнасці. Я ніколі не іграла чужую ролю, не раздувала ўласную значнасць, не гналася за нейкай мішурой ці яшчэ нечым. Мабыць, мая шчырасць і адкрытасць і з'яўляюцца асновай таго, што да мяне не губляецца інтарэс. А вось наконт планавання, то, калі б умела рабіць гэта дасканала, змагла б дасягнуць большых вяршынь. Асабліва ў фінансавым плане. Я ж, наадварот, кіруюся эмоцыямі. Мяне ў першую чаргу хвалюе, ці добра іншым.

**«Я ганаруся сваёй сям'ёй, дзецьмі. Адчуванне, быццам рэалізавала сябе на сто працэнтаў, няма. Спадзяюся, усё яшчэ наперадзе і мне ёсць да чаго імкнуцца».**

***— Пры ўсёй занятасці, сям'я ў вас на першым месцы?***

— Так, родныя і блізкія для мяне заўсёды ў прыярытэце. Таксама і з сябрамі, калі некаму патрабуецца дапамога. Лічу, што гэта правільна.

***— Чым абумоўлена жаданне шукаць сябе ў розных відах дзейнасці?***

— Мне цікава займацца тым, што прыносіць мне задавальненне. І, безумоўна, у свой час была ўзнята высокая планка. А ўвогуле, раблю тое, да чаго ляжыць душа.

***— Што сёння патрэбна беларускай публіцы?***

— На гэтае пытанне цяжка адказаць. У нас на тэлебачанні сёння не так шмат забаўляльных праектаў, таму і артысты, напрыклад, не бачаць сэнсу ў выпуску кліпаў. Дзе ўсё гэта паказваць? І застаецца вечнае пытанне: што за людзі на сцэне? Такі наш менталітэт. Пакуль не з'явіцца гонар за сваю краіну і за сваіх людзей, ад гэтага не пазбавіцца. Публіка патрабуе, каб пра яе клапаціліся. Ёй хочацца ведаць, што менавіта яна найлепшая!

***— У вас было шмат тэлевізійных праектаў і нават перспектыва з'ехаць у Маскву...***

— Мне часта нагадваюць пра гэта, але я не магу даць дакладнага адказу, таму што не пражыла тое жыццё, якое мела б там. Веру, лёс заўсёды прыводзіць нас туды, дзе нам наканавана быць. Магчыма, калі б у Маскве мне прапанавалі пэўную стабільнасць у плане працы і жылля, тады магла думаць. Але людзі, якімі я даражыла ў Беларусі, аказаліся для мяне важнейшымі, чым кар'ерны рост.

**«Ніколі не іграла чужую ролю, не раздувала ўласную значнасць, не гналася за нейкай мішурой ці яшчэ нечым. Мабыць, мая шчырасць і адкрытасць і з'яўляюцца асновай таго, што да мяне не губляецца інтарэс».**

***— Азіраючыся на пройдзены шлях, вы маеце чым ганарыцца?***

— Я ганаруся сваёй сям'ёй, дзецьмі. Адчуванне, быццам рэалізавала сябе на сто працэнтаў, няма. Спадзяюся, усё яшчэ наперадзе і мне ёсць да чаго імкнуцца.

**Алена ДРАПКО.**



ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.183.
Нумар падпісаны ў 19.30 08.07.2015 г.